

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я.КУПАЛЫ

№ 1 (218) 13 студзеня 1995 года, пятніца


## ВІНШАВАННЕ ЮБІЛЯРУ



50

*7 студзеня споўнілася 50 гадоў нашаму настаўніку, рэктару універсітэта, доктару фізіка-матэматычных навук, прафесару Ківачу Леаніду Мікалаевічу.*

*Атрымаўшы вышэйшую адукацыю і скончыўшы аспірантуру ў Белдзяржуніверсітэце ў 1970 г., Вы ўсур'ёз і надоўга прыехалі працаваць у Гродзенскі дзяржуніверсітэт, узяўшы з сабою веды і вопыт вялікіх вучоных і педагогаў Сеўчанкі А.Н.,Валадзько Л.В., Саржэўскага А.М. Адразу пачалася мэтанакіраваная дзейнасць па стварэнню ў нашым універсітэце ўласнай навуковай школы. Быў вызначаны навуковы накірунак - «Спектраскапія біяарганічных малекулаў». Гэта адпавядала мясцовым умовам і найбольш перспектыўным напрамкам развіцця аптычнай спектраскапіі. Дасканалыя веды і арганізацыйны талент, памножаныя на працу да дзейнасці і веру ў канчатковы поспех, далі свае вынікі. Былі выкананы першыя гаспадарча-дагаварныя тэмы, абаронены першыя на фізічным факультэце дысертацыйныя працы.*

*Надрукаваныя прыярытэтныя навуковыя артыкулы, ў тым ліку і за мяжою, а таксама праведзеныя навуковыя канферэнцыі ўсесаюзнага ўзроўню засведчылі аб прызнанні навуковой школы, створаной Вамі. Лагічным працягам Вашай навуковай дзейнасці з'явілася абарона доктарскай дысертацыі. Для навуковай дзейнасці нашага калектыву асабліва важна тое, што на сённяшні дзень мы маем тэмы, якія ўключаны ў фінансуемыя еўрапейскія праекты. Гэта сведчыць аб міжнародным узроўні навуковых распрацовак.*

*Ваша імя як вучонага і арганізатара добра вядома сярод вучоных і спецыялістаў у многіх краінах, што спрыяе творчаму развіццю кожнага з нас, вашых вучняў. Ведаем, что Вы, Леанід Мікалаевіч поўны энергіі і новых творчых задумкаў. Мы гатовы дапамагчы Вам у іх пераўтварэнні ў жыццё.*

*Віншуем Вас, шаноўны Леанід Мікалаевіч, з юбілеем! Жадаем моцнага здароўя Вам і Вашым родным, поспехаў у працы на карысць універсітэта!*

**Вашы калегі і вучні**
**Г.Гачко, С.Маскевіч, Ю.Вайтукевіч, А.Маскевіч, А.Нікіцін, Г.Васілюк, А.Апякун, Г.Панюцін, С.Падтычанка,Н.Стракаль.**

## ЭКСПРЭС-ІНФАРМАЦЫЯ

● У тую пятніцу, 6 студзеня, на рэктараце Леанід Мікалаевіч Ківач падпісаў з прадстаўніком Міністэрства адукацыі і навукі намеснікам міністра Галко Т.Я. 2-гадовы кантракт на працу на пасадзе рэктара. Віншуем універсітэт з тым, што ў асобе разумнага чалавека ён набыў разумнага рэктара і спадзяемся, што наш універсітэт стане сапраўды нацыянальным універсітэтам,і духам яго будуць апекавацца ўніверсальнасць і свабода.

● Кафедра беларускай літаратуры распрацоўвае літаратурна-краязнаўчыя даведнікі па рэгіёнах Гродзеншчыны. 20 снежня 1994 года было выяздное пасяджэнне кафедры ў Слоніме. Адбыліся сустрэчы ў рэдакцыі газеты «Слонімскі вестнік» з супрацоўнікамі рэдакцыі і мясцовымі пісьменнікамі, а таксама з гарадской інтэлегенцыяй у Слонімскім беларускім драматычным тэатры.

● У канцы снежня ўзнікла шмат пытанняў аб атрыманай зарплаце. Вось што наконт гэтага паведамілі ў бухгалтэрыі. Замест патрэбных для выдачы заработнай платы 235 млн рублёў на другую палову снежня Міністэрства выдзеліла толькі 120 млн рублёў і 42 млн на сацстрах. Пагэтаму было вырашана ў мэтах матэрыяльнай падтрымкі супрацоўнікаў ажыццявіць авансавыя выплаты з пазабюджэтных фондаў у наступных памерах: прафесарска-выкладчыцкаму складу - па 50 000, адміністрацыі - па 50 000, вучэбна-дапаможнаму персаналу - па 50 000 і астатняму персаналу - па 20 000 рублёў. Гэтыя грошы будуць утрыманы ў студзеньскі аванс.

● З 10 студзеня пачаліся спаборніцтвы па міні-футболу паміж выкладчыкамі і супрацоўнікамі ўсіх факультэтаў універсітэта.Спяшайцеся на футбол! Вам прадастаўляецца цудоўная магчымасць афіцыйна «абсвістаць» сваіх выкладчыкаў!





## ЗАГАД

***N 647 АД 05.12.94 Г.***

Аб назначэнні імянных стыпендый і стыпендый Вучонай Рады універсітэта

На падставе рашэння Вучонай Рады Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы ад 29.11.94 г. ( пратакол N 3)

***з а г а д в а ю :***

1. Устанавіць з 1.09.94 г. імянныя стыпендыі і стыпендыі Вучонай Рады універсітэта наступным студэнтам:

***імя Леніна***

1. Салею Сяргею Міхайлавічу - V курс I група факультэта гісторыі і культуры.

2. Грыню Аляксандру Аляксандравічу - V курс 3 група матэматычнага факультэта.

***імя Янкі Купалы***

1. Маліноўскай Наталлі Аляксандраўне - IV курс I група факультэта філалогіі.

***Вучонай Рады універсітэта***

1. Якубелю Генадзю Іванавічу - V курс I група факультэта біялогіі і экалогіі.

2. Загоскінай Вользе Анатолеўне - IV курс 3 група факультэта псіхалогіі і педагогікі.

3. Майсею Юрыю Рышардавічу - IV курс I група факультэта права і эканомікі.

***імя Карскага***

1. Кавецкай Алене Анатолеўне - III курс 3 група факультэта замежных моў (руска-беларускае аддзяленне).

**Рэктар Л.М.Ківач**

## ЗАГАД

***N 648 АД 05.12.94 Г.***

Аб устанаўленні надбаўкі да імянных стыпендый

У мэтах матэрыяльнага заахвочвання за выдатныя поспехі ў вучобе

***з а г а д в а ю :***

I. Устанавіць з 1.09.94 г. надбаўку да імяннай стыпендыі імя Леніна ў памеры 30% ад памеру імяннай стыпендыі імя Леніна ў месяц Грыню Аляксандру Аляксандравічу - студэнту V курса 3 групы матэматычнага факультэта ў мэтах матэрыяльнага заахвочвання за выдатныя поспехі ў вучобе.

II. Устанавіць з 1.09.94 г. надбаўку да стыпендыі Вучонай Рады універсітэта ў памеры 30% ад памеру стыпендыі Вучонай Рады універсітэта ў месяц ў мэтах матэрыяльнага заахвочвання за выдатныя поспехі ў вучобе наступным студэнтам:

1. Якубелю Генадзю Іванавічу - V курс I група факультэта біялогіі і экалогіі.

2. Загоскінай Вользе Анатолеўне - IV курс 3 група факультэта псіхалогіі і педагогікі.

3. Майсею Юрыю Рышардавічу - IV курс I група факультэта права і эканомікі.

III. Устанавіць з 1.09.94 г. надбаўку ў памеры 10% у месяц у мэтах матэрыяльнага заахвочвання за выдатныя поспехі ў вучобе наступным студэнтам:

1. Салею Сяргею Міхайлавічу - ад памеру імяннай стыпендыі імя Леніна (5 курс I група факультэта гісторыі і культуры).

2. Маліноўскай Наталлі Аляксандраўне - ад памеру імяннай стыпендыі імя Янкі Купалы ( 4 курс I група факультэта філалогіі).

3. Кавецкай Алене Анатолеўне - ад памеру імяннай стыпендыі імя Карскага ( 3 курс 3 група факультэта замежных моў).

**Рэктар Л.М.Ківач**

***СУМЫ, ВЫДЗЕЛЕНЫЯ НА ФАКУЛЬТЭТЫ ДЛЯ ПРЭМІРАВАННЯ СТУДЭНТАЎ:***

1. Матэматычны факультэт - 3600000 руб.
2. Фізіка-тэхнічны факультэт - 3500000 руб.
3. Факультэт замежных моў - 2880000 руб.
4. Факультэт філалогіі - 4600000 руб.
5. Факультэт гісторыі і культуры - 2600000 руб.
6. Факультэт права і эканомікі - 3720000 руб.
7. Факультэт права і эканомікі, міжнародныя эканамічные зносіны - 700000 руб.
8. Факультэт біялогіі і экалогіі - 2200000 руб.
9. Факультэт фізічнай культуры - 3100000 руб.
10. Факультэт псіхалогіі і педагогікі - 2500000 руб.
11. Факультэт псіхалогіі і педагогікі, аддзяленне мастацтваў -600000 руб.

# НАША СТРАТЭГІЯ - ВЫДАВАЦЬ ДОБРЫЯ ПАДРУЧНІКІ

***З Аляксандрам Вялько, начальнікам выдавецкага аддзела, сустрэўся наш карэспандэнт Л.Савіцкі.***

***Кар. Якія задачы вырашае аддзел?***

***Вялько***: Выдавецкі аддзел, як вядома, створаны нядаўна,- у канцы ліпеня. У складзе аддзела - рэдакцыя газеты «Гродзенскі універсітэт», ратапрынтны ўчастак, рэдактары. Асноўная наша стратэгія - выдаваць добрыя падручнікі і дапаможнікі для сістэмы адукацыі .

***Кар. Ці рэальна сёння ў нас, ва універсітэце, выдаваць добрыя кнігі?***

***Вялько***: Так. Гэта рэальна. Павінен сказаць, што мы ў выдавецкім аддзеле гатовы разглédзець прапановы аўтараў. І калі кніга,- ці то падручнік, ці то дапаможнік, - неабходна для навучальнага працэсу, абавязкова надрукуем. Дарэчы, можам выдаваць і мастацкія творы, але тут павінны захоўвацца прынцыпы эканамічнай выгады для універсітэта. На жаль, ва універсітэце толькі адна друкарская машына. Ды і тая « у шаноўным узросце», не спраўляецца з вялікай нагрузкай. Да таго ж камплектуючыя даводзіцца купляць за валюту.

***Кар. І якое ж выйсце?***

***Вялько***: Лічу, што універсітэту неабходна закупіць сучасныя, эканамічныя машыны. Для пачатку хаця б адну... Але патрэбна многа грошай.

***Кар. Якіх няма.***

***Вялько***: Так. Рэктарат выдзеліў частку сродкаў, але іх вельмі мала. Вядома, можна пакрысе збіраць грошы, якія будуць паступаць ад выдання кніг, дапаможнікаў, іншай друкаванай прадукцыі. Неўзабаве ў галоўным корпусе універсітэта адкрыецца кніжны кіёск, дзе будуць рэалізоўвацца нашыя выданні. Будзе пэўны прыбытак.Але новая тэхніка каштуе вельмі дорага, і шлях збору сродкаў на яе па крохах- гібельны, паколькі львіную долю сабраных грошай давядзецца аддаваць на рамонт старога абсталявання.



***Кар. І ях хутка гэтыя затраты акупяцца?***

***Вялько***: Паверце майму сціпламу вопыту: акупяцца. Ва ўмовах рынку універсітэт будзе мець магчымасць выдаваць неабходныя падручнікі самастойна і нават зарабляць грошы. Нагадаю, што яшчэ каля года назад я пераконваў многіх ва універсітэце, што неабходна ў нас заняцца выдавецкай дзейнасцю, што гэта перспектыўна. Але мае прапановы не ўспрымалі, нават смяяліся. А калі затым на працягу года гэтыя ідэі былі рэалізаваныя ў камерцыйнай структуры і сталі рэальнасцю, то... Як гаворыцца, «смяецца той, хто смяецца апошні».Цяпер рэктарат падтрымлівае нас, і мы шукаем аптымальны варыянт набыцця паліграфічнага абсталявання.



# КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР

## ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я.КУПАЛЫ НА 1995 г.

### *РАЗДЗЕЛ 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ*

*1.1.* Калектыўны дагавор з'яўляецца нарматыўным актам, які рэгулюе працоўныя і сацыяльна-эканамічныя адносіны паміж адміністрацыяй і супрацоўнікамі універсітэта.

Калектыўны дагавор заключаецца паміж адміністрацыяй Гродзенскага універсітэта ў асобе рэктара і працоўным калектывам, ад імя якога выступае прафсаюзны камітэт, прымаецца на канферэнцыі працоўнага калектыва, падпісваецца рэктарам і старшынёй прафкама і ўступае ў сілу з 1 студзеня 1995 года.

*1.2.* Калектыўны дагавор заключаецца на падставе дзеючага заканадаўства РБ, «Пагаднення паміж Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і Рэспубліканскім камітэтам прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі» ад 7.02.94 г., Статута універсітэта і наладжвае ўзаемныя абавязкі адміністрацыі і прафсаюзнага камітэта па рашэнню працоўных і сацыяльна-эканамічных задачаў.

*1.3.* Адміністрацыя універсітэта прызнае прафкам адзіным прадстаўніком працоўнага калектыву пры заключэнні калектыўнага дагавора, а таксама пры рашэнні ўсіх пытанняў, звязаных з яго выкананнем.

*1.4.* Адміністрацыя сумесна з прафсаюзным камітэтам абавязана ажыццяўляць кантроль за ходам выканання калектыўнага дагавора, даваць справаздачу перад працоўным калектывам аб яго выкананні не менш 2 разоў у год.

*1.5.* Прафсаюзны камітэт можа заслухоўваць прадстаўнікоў адміністрацыі і кіраўнікоў падраздзяленняў па выкананню абавязкаў калектыўнага дагавора, патрабаваць прыпынення выканання рашэнняў, калі яны прыняты ў парушэнне яго палажэнняў ці дзеючага заканадаўства.

*1.6.* Адміністрацыя павінна ў тэрмін да 10 дзён разглядаць прадстаўленні прафсаюзнага камітэта аб існуючых недахопах у выкананні калектыўнага дагавора і даваць матываваны адказ па іх выпраўленню ў пісьмовай форме.

1.7. Адміністрацыі і прафсаюзнаму камітэту даецца права па ўзаемнай згодзе пераносіць тэрміны выканання мерапрыемстваў, вызначаных у асобных раздзелах калектыўнага дагавора.

*1.8.* Прафсаюзны камітэт прымае ўдзел у распрацоўцы праекта Статута універсітэта ці зменаў, дапаўненняў, якія ўносяцца ў дзеючы Статут і Правілы ўнутранага распарадку.

*1.9.* Асноўнымі прынцыпамі заключэння калектыўнага дагавора з'яўляюцца:

- сацыяльнае партнёрства;
- раўнапраўе бакоў;
- улік рэальных магчымасцяў матэрыяльнага, вытворчага і фінансавага забеспячэння абавязкаў, якія прымаюцца.

*1.10.* Адміністрацыя і прафсаюзны камітэт даводзяць да ўсіх работнікаў тэкст калектыўнага дагавора ў месячны тэрмін з дня падпісання і забяспечваюць галоснасць яго выканання.

### *РАЗДЗЕЛ 2. АРГАНІЗАЦЫЯ, НАРМІРАВАННЕ І АПЛАТА ПРАЦЫ*

**Адміністрацыя павінна:**

*2.1.* Распрацаваць праграму эфектыўнага навуковага і эканамічнага развіцця матэрыяльнай базы універсітэта ва ўмовах рыначнай эканомікі.

*2.2.* Захаваць парадак замяшчэння пасадаў прафесарска-выкладчыцкага саставу на конкурснай аснове.

*2.3.* Стварыць умовы для павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў - (не менш аднаго раза на працягу 5 гадоў) згодна з планам падраздзяленняў і перспектыўным планам развіцця універсітэта.

*2.4.* Не дапускаць неабгрунтаванага, незаконнага скарачэння работнікаў і працоўных месцаў.

*2.5.* Размяркоўваць чысты прыбытак, атрыманы ад камерцыйнай і гаспадарчай дзейнасці з улікам сацыяльна-эканамічных інтарэсаў працоўнага калектыва. Распрацаваць сумесна з прафсаюзным камітэтам Палажэнне аб памеры долі гэтага прыбытку і парадку яго размеркавання.

*2.6.* Своечасова здзяйсняць кампенсацыі і індэксацыі па заработнай плаце з улікам росту спажывецкіх цэнаў у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

*2.7.* Устанаўліваць даплаты да тарыфных ставак і службовых акладаў па пераліку працы са шкоднымі ўмовамі працы, а таксама за працу ў начную змену, у выхадныя і святочныя дні, адпаведна дзеючаму заканадаўству.

*2.8.* Выплату заработнай платы праводзіць строга па зацверджанаму графіку: 1-3 і 16-18 кожнага месяца. Супрацоўнікам, якія своечасова не атрымалі зарплату без уважлівай прычыны, дэпаненцкая запазычанасць выдаецца толькі ў дні чарговых выплатаў.

*2.9.* Не планаваць нагрузку прафесарска-выкладчыцкаму складу больш шасці гадзінаў аўдыторных заняткаў у дзень без іх згоды.

*2.10.* Для рабочых і служачых, якія не прымаюць удзел непасрэдна ў вучэбным працэсе, устанаўліваецца 5-дзённы працоўны тыдзень. Спіс рабочых і служачых зацверджваецца загадам рэктара універсітэта. Час пачатку і заканчэння працы ўстанаўліваецца кіраўнікамі структурных падраздзяленняў зыходзячы з 8-гадзіннага працоўнага дня.

*2.11.* Для супрацоўнікаў з нарміраваным працоўным днём адміністрацыя павінна арганізаваць улік прыходу на працу і адыходу з працы, распрацаваць функцыянальныя абавязкі вучэбна-дапаможнаму персаналу.

*2.12.* Выплату адпускных грошай здзяйсняць строга ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

*2.13.* Умовы працы па індывідуальных кантрактах не павінны быць горшымі за ўмовы працы, якія ўстаноўлены калектыўным дагаворам.

*2.14.* Сістэматычна здзяйсняць кантроль за правільнасцю разлікаў па зарплаце, нарміраванню і аплаце працы супрацоўнікам універсітэта. Выдачу разліковых лістоў праводзіць па ўсіх відах заработнай платы.

*2.15.* Адміністрацыі сумесна з прафкамам распрацаваць і зацвердзіць на Вучонай Радзе Палажэнне аб прэміраванні і дэпрэміраванні супрацоўнікаў з наступным апублікаваннем у газеце «Гродзенскі універсітэт».

### *РАЗДЗЕЛ 3. АХОВА ПРАЦЫ, УМОВЫ ПРАЦЫ І ТЭХНІКА БЯСПЕКІ*

**Адміністрацыя павінна:**

*3.1.* Своечасова праводзіць усе віды інструктажу па АП, ТБ і проціпажарнай прафілактыцы.

*3.2.* Рэгулярна праводзіць навучанне і праверку ведаў супрацоўнікаў, якія заняты на работах з павышанай небяспекай.

*3.3.* Правесці максімальнае скарачэнне працоўных месцаў, якія не адпавядаюць патрабаванням і нормам аховы працы ў вытворчасці са шкоднымі ўмовамі працы.

*3.4.* Перыядычна (раз у год) кантраляваць адпаведнасць санітарных пашпартоў памяшканняў універсітэта дзейнічаючым санітарным Нормам і Правілам.

*3.5.* Кіравацца Пералікам работаў і прафесій, па якіх супрацоўнікі маюць права на атрыманне дадатковага адпачынку ў сувязі са шкоднымі ўмовамі працы, а таксама надбаўкі да заработнай платы і іншыя льготы.

*3.6.* Своечасова забяспечыць супрацоўнікаў уні-





версітэта, працуючых у шкодным асяроддзі, спецадзеннем, спецабуткам і іншымі сродкамі ў адпаведнасці з існуючымі Нормамі і Правіламі.

*3.7.* Своечасова праводзіць абмеркаванне няшчасных здарэнняў, траўматызму, выдаваць загады аб пакаранні віноўных асобаў.

*3.8.* Скараціць да мінімума колькасць вячэрніх заняткаў для выкладчыкаў-жанчын, якія маюць дзяцей школьнага ўзросту, і не прыцягваць да вячэрніх заняткаў жанчын, якія маюць дзяцей дашкольнага ўзросту, без іх згоды.

*3.9.* Забяспечыць выкананне мерапрыемстваў па пагадненню па ахове працы і ТБ (дадатак N 1).

## РАЗДЗЕЛ 4. ПРАЦОЎНАЯ ДЫСЦЫПЛІНА, ПЕРАВОДЫ, ЗВАЛЬНЕННІ І ПРАВАВЫЯ ГАРАНТЫІ

**Адміністрацыя павінна:**

*4.1.* Выкарыстоўваць меры заахвочвання за поспехі ў навукова-педагагічнай і вытворчай дзейнасці з улікам асабістага ўклада ў вучэбную і навуковую дзейнасць.

*4.2.* Прымяняць да парушальнікаў працоўнай і вучэбнай дысцыпліны санкцыі дзеючага працоўнага заканадаўства РБ.

*4.3.* За страты, прычыненыя наймальніку пры выкананні працоўных абавязкаў, работнікі універсітэта, па віне якіх прычынены страты, нясуць абмежаваную матэрыяльную адказнасць (не больш за сярэднямесячны заработак) за выключэннем выпадкаў, якія ўказваюцца ў заканадаўстве. Устанавіць для работнікаў універсітэта рэжым працы згодна з Правіламі ўнутранага распарадку і заканадаўствам аб працы Рэспублікі Беларусь.

*4.4.* Адміністрацыя абавязана паведаміць работніка аб увядзенні новых ці змяненні дзейсных умоваў аплаты працы не пазней, чым за адзін месяц. Распрацаваць Пералік работ і пасад работнікаў універсітэта, з якімі павінны заключацца дагаворы аб поўнай матэрыяльнай адказнасці.

*4.5.* Прадстаўляць загады аб устанаўленні парадку аплаты і ўмоў працы па ўзгадненню з прафкамам не пазней, чым за месяц да выканання.

*4.6.* Даваць штогадовыя водпускі супрацоўнікам універсітэта па графіку, зацверджанаму кіраўніком структурнага падраздзялення і ўзгодненаму з прафсаюзным камітэтам. У асобных выпадках па-за графікам па рашэнню адміністрацыі і ўзгадненню з прафкамам без шкоды для вучэбнай і навукова-вытворчай дзейнасці.

*4.7.* Скасаваць працоўны дагавор, заключаны на нявызначаны тэрмін, калі работнік папярэдзіў адміністрацыю пісьмовай заявай за адзін месяц.

*4.8.* Аператыўна разглядаць скаргі супрацоўнікаў па канфліктных сітуацыях у падраздзяленнях універсітэта і прымаць па іх рашэнні ва ўстаноўленыя законам тэрміны.

*4.9.* Супрацоўнікам, якія прапрацавалі ва ўніверсітэце не менш 10 гадоў, адміністрацыя, пры наяўнасці сродкаў, аказвае разавую матэрыяльную дапамогу пры выхадзе на пенсію.

4.10. **Адміністрацыя гарантуе:**

*4.10.1.* Даваць магчымасць жанчынам, якія маюць 2-х дзяцей да 16 гадоў, па іх пісьмовай просьбе, штомесячна адзін вольны ад працы дзень без захавання заработнай платы. Канкрэтны дзень адпачынку вызначаецца па ўзаемнай згодзе.

*4.10.2.* Не звальняць адзінокіх маці, якія маюць дзяцей ва ўзросце да 14 гадоў (ці дзіця-інваліда да 16 гадоў) за выключэннем выпадку ліквідацыі структурных падраздзяленняў універсітэта.

*4.10.3.* На падставе арт. 207 КЗоТ РБ ствараць з аднолькавага ліку прадстаўнікоў адміністрацыі і прафсаюза, тэрмінам на адзін год, камісію па працоўных спрэчках.

*4.10.4.* Даваць па просьбе работнікаў водпускі без захавання заработнай платы па ўзгадненню з кіраўнікамі падраздзяленняў універсітэта у неабходных выпадках.

*4.11.* Бакі прыйшлі да згоды:

*4.11.1.* Скасаванне працоўнага дагавора па ініцыятыве адміністрацыі па п.2,5 арт.33 КЗоТ РБ здзяйсняецца з папярэдняй згоды прафкама, па п.1, 3, 4, 7, 8, арт. 33, п. 2, 3 арт. 254 КЗоТ РБ - пасля папярэдняга, але не пазней, чым за два тыдні, паведамлення прафкама.

## РАЗДЗЕЛ 5. ПЫТАННІ ЖЫЛЛЯ, БЫТУ, АЗДАРАЎЛЕНЧАЯ І СПАРТЫЎНА-МАСАВАЯ РАБОТА

**Адміністрацыя і прафкам павінны:**

*5.1.* Хадатайнічаць перад Міністэрствам адукацыі і навукі аб мэтавым вызначэнні сродкаў ў 1995 годзе на будаўніцтва ЖБК работнікам універсітэта, якія маюць вострую патрэбу ў атрыманні жылля.

*5.2.* Выканаць усе неабходныя работы, звязаныя з заканчэннем будаўніцтва дома для выкладчыкаў універсітэта па вул. Горкага.

*5.3.* Размеркаванне жылля здзяйсняць ў строгай адпаведнасці с ЖК РБ.

*5.4.* Выкладчыкі і супрацоўнікі, якія маюць забяспечанасць жылплошчай менш 8 м.кв. на члена сям'і, якія добрасумленна працуюць ва універсітэце 20 і больш гадоў і маюць дасягненні ў навукова-даследчай і вучэбна-метадычнай працы, маюць права на атрыманне жылля.

*5.5.* Стварыць для асоб, пералічаных у п.5.4. асобны спіс чарговасці на атрыманне жылля.

*5.6.* Аднесці да льготнай групы маючых патрэбу ў атрыманні жылля выкладчыкаў і супрацоўнікаў, якія працавалі ва універсітэце больш 20 гадоў.

*5.7.* Пры размеркаванні жылля ў інтэрнатах улічваць не толькі час падачы заяў, але і стаж работы выкладчыкаў і супрацоўнікаў.

*5.8.* Садзейнічаць развіццю садаводчых таварыстваў, уключаючы фінансавую дапамогу.

*5.9.* Дапамагаць работнікам, якія пражываюць на прыватных кватэрах і ў інтэрнатах, у атрыманні пазык і крэдытаў у сістэме банкаў.

*5.10.* Працягваць работу па задавальненню заяў на атрыманне садаводчых участкаў у новых садаводчых таварыствах.

*5.11.* Забяспечваць навагоднімі падарункамі дзяцей дашкольнага ўзросту.

*5.12.* Ствараць умовы для правядзення заняткаў мастацкай самадзейнасці, гурткоў па інтарэсах, спартыўных секцый.

*5.13.* Садзейнічаць забеспячэнню сельгаспрадуктамі і прадуктамі харчавання работнікаў універсітэта.

*5.14.* Аказваць матэрыяльную дапамогу ў выпадках смерці для аплаты рытуальных паслуг.

*5.15.* Аддзелу арганізацыі аховы здароўя сумесна з прафкамам распрацаваць сістэму мерапрыемстваў па ахове здароўя супрацоўнікаў універсітэта.

## РАЗДЗЕЛ 6. ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ПРАВАВЫХ ГАРАНТЫЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПРАФСАЮЗА

**Адміністрацыя павінна:**

*6.1.* Прадастаўляць прафкаму звесткі па выкарыстанню фондаў, аплаце працы, валютных аперацыях, камерцыйнай дзейнасці, па розных выплатах узнагародаў і прэмій з фондаў і даходаў універсітэта.

*6.2.* Прадастаўляць прафкаму ў бясплатнае карыстанне займаемыя ім памяшканні для працы, сродкі сувязі і аргтэхніку, канферэнцзалу.

*6.3.* Не дапускаць звальнення па ініцыятыве адміністрацыі асоб, якія былі абраны ў склад прафкама, на працягу двух гадоў пасля заканчэння выбарных паўнамоцтваў, акрамя выпадкаў ліквідацыі універсітэта ці здзяйснення работнікам віноўных учынкаў, за якія заканадаўствам прадугледжана магчымасць звальнення. Звальненне вызваленага старшыні прафкама дапускаецца, акрамя таго, толькі са згоды вышэйстаячага прафсаюзнага органа.

*6.4.* Даць папярэдняе месца работы (пасаду), а пры яго адсутнасці іншую раўнацэнную работу (пасаду) абраным у прафсаюзныя органы работнікам пасля заканчэння іх выбарных паўнамоцтваў.



*6.5.* Захаваць дзеючы парадак платы прафсаюзных узносаў шляхам іх пераліку праз бухгалтэрыю універсітэта.

**Прафсаюзны камітэт мае абавязкі:**

*6.6.* Падтрымліваць прымаемыя меры адміністрацыі па ўмацаванню навукова-педагагічнай і вытворчай дысцыпліны, забеспячэнне парадку і арганізацыі вучэбнага працэсу, захаванасці ўласнасці і выхавання ў членаў працоўнага калектыву добрасумленных адносінаў да працы.

*6.7.* Здзяйсняць пастаянны кантроль за ходам выканання калектыўнага дагавору і перыядычна, не менш аднаго раза ў паўгоддзе, інфармаваць па гэтаму пытанню працоўны калектыў.

*6.8.* Прафсаюзны камітэт прызнае, што забастоўка з'яўляецца крайнім сродкам вырашэння спрэчак і лічыць магчымым прымяняць яе толькі тады, калі ўсе іншыя законныя сродкі не дадуць вынікаў.

***РАЗДЗЕЛ 7. ЗАХАВАННЕ ІНТАРЭСАЎ РАБОТНІКАЎ ПРЫ ПРАВЯДЗЕННІ ПРЫВАТЫЗАЦЫІ***

*7.1.* Бакі прыйшлі да вываду:

*7.1.1.* Пры змяненні форм уласнасці і гаспадарання, стварэнні (заснаванні) малых, сумесных, іншых прадпрыемстваў, фірм, кааператываў, дзе задзейнічаны асноўныя фонды і сродкі універсітэта, адміністрацыяй праводзяцца папярэднія перамовы з прафсаюзным камітэтам з мэтай дасягнення згоды ў пытаннях, якія закранаюць сацыяльна-эканамічныя інтарэсы калектыву.

*7.1.2.* Перадача, здача ў арэнду маёмасці, якая належыць універсітэту, дапускаецца з улікам меркаванняў прафсаюзнага камітэта.

*7.1.3.* Не дапускаць прыняцця неабгрунтаваных рашэнняў і прымусовай прыватызацыі.

| NN п/п | Змест мерапрыемстваў | Тэрмін | Адказны за выкананне мерапрыемстваў (работ) |
|---|---|---|---|
| 1 | Своечасова забяспечыць супрацоўнікаў універсітэта спецадзеннем, спецабуткам, ахоўнымі сродкамі ў адпаведнасці з Правіламі і Нормамі. | На працягу года | Прарэктар па АХР, кіраўнікі структурны падраздзял |
| 2 | Забяспечваць бясплатным мылам на работах, звязаных з забруджваннем. | -"- | -"- |
| 3 | Забяспечваць замену спецадзення, спецабутку, якія прыйшлі ў непрыгоднасць не па віне работніка, датэрмінова | -"- | -"- |
| 4 | Набыць медыкаменты для папаўнення аптэчак вучэбных карпусоў, інтэрнатаў і лабараторый | 1-ы квартал | Інжынер па ТБ |
| 5 | Правесці бягучы рамонт усіх інтэрнатаў | На працягу года | Інжынеры па рамонту |
| 6 | Правесці рамонт рулоннай кроўлі ў інтэрнаце N 4. | -"- | -"- |
| 7 | Правесці выбарачны рамонт вучэбных корпусаў | -"- | -"- |
| 8 | Правесці рамонт і мантаж вентыляцыйных сістэм у вучэбным корпусе N 2 і інтэрнаце N 4. | -"- | -"- |
| 9 | Добраўпарадкаваць тэрыторыю інтэрната N 4. | -"- | -"- |
| 10 | Правесці частковы рамонт унутранай сістэмы ацяплення інтэрната N 2. | -"- | -"- |

# ПАСТАНОВА

## справаздачна-выбарнай канферэнцыі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я.Купалы ад 25 лістапада 1994 года

**Аб працы прафкама выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта за перыяд з 31 кастрычніка 1989 года па 31 кастрычніка 1994 года.**

Заслухаўшы і абмеркаваўшы справаздачу аб працы прафкаму за перыяд з 31 кастрычніка 1989 г. па 31 кастрычніка 1994 г., прафсаюзная канферэнцыя адзначае, што прафсаюзны камітэт за справаздачны перыяд узмацніў сваё ўздзеянне на рашэнне праблем, звязаных з абаронай працоўных і сацыяльна-эканамічных інтарэсаў і правоў работнікаў універсітэта, актывізаваў дзейнасць па ўдасканаленню формаў і метадаў правядзення культурна-масавай і спартыўна-аздараўленчай працы, памацнеў арганізацыйна, абагаціўся новым вопытам працы.

Разам з тым у дзейнасці прафкаму мелі месца і недахопы. Пры вырашэнні вытворчых і сацыяльных пытанняў прафкам у недастатковай ступені ўлічваў меркаванні членаў працоўнага калектыву, не заўсёды па-баявому, мэтанакіравана і настойліва абараняў працоўныя і сацыяльна-эканамічныя інтарэсы супрацоўнікаў, праяўляў інэртнасць у працы з прафсаюзным актывам, недастаткова ажыццяўляў кантроль за выкананнем адміністрацыяй калектыўнага дагавору, своечасовай выплатай заработнай платы і камандзіровачных выдаткаў.

Справаздачна-выбарная прафсаюзная канферэнцыя выкладчыкаў і супрацоўнікаў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я.Купалы

пастанаўляе:

1.Працу прафкама выкладчыкаў і супрацоўнікаў за справаздачны перыяд прызнаць задавальняючай.

2.Справаздачу аб працы рэвізійнай камісіі зацвердзіць.

3.Прафсаюзная канферэнцыя лічыць неабходным:

а)прафкаму актывізаваць працу з прафсаюзным актывам, арганізаваць яго сістэматычнае навучанне і аказваць яму пастаянную дапамогу ў практычнай дзейнасці;

б)прадаставіць прафгрупам, прафбюро і цэхавым арганізацыям права самастойна вызначаць прыярытэтныя кірункі сваёй дзейнасці, рашаць пытанні ўласнай структуры, перыядычнасць правядзення прафсаюзных сходаў, вытворчых нарадаў і пасяджэнняў прафбюро;

в)прафкаму распрацаваць асноўныя напрамкі дзейнасці пастаянных камісій, скіраваных на абарону працоўных, сацыяльных, эканамічных інтарэсаў і правоў сваіх членаў.

4.Прафкаму сумесна з рэктаратам працягваць працу па ўмацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы універсітэта, аснашчэнні і пераўзбройванні навукова-даследчага і навучальнага працэсаў, дабівацца, каб гэтыя мерапрыемствы насілі мэтанакіраваны характар, адказвалі задачам павышэння якасці падрыхтоўкі маладых спецыялістаў, паляпшэнні ўмоваў іх працы і быту. З гэтай мэтаю даручыць старшыні прафкама звярнуцца ад імя ўдзельнікаў канферэнцыі ў ВС і СМ РБ:

- забяспечыць выкананне закона «Аб адукацыі ў РБ» у частцы фінансавання вышэйшай школы і вызначэнн

*(Заканчэнне на 6-й стар.)*



*(Заканчэнне. Пачатак на 5-й стар.).*

заработнай платы прафесарска-выкладчыцкаму складу не ніжэй за 150% ад сярэдняй заработнай платы служачых у прамысловасці;

- выдзеліць ільготныя крэдыты для працоўных вышэйшай школы на будаўніцтва ЖБК і індывідуальнага жылля;
- прадаставіць установам адукацыі і навукі льготнае падаткаабкладанне;
- вызначыць для працоўных вну кампенсацыю на аплату медыцынскіх паслугаў, лячэння і адпачынку.

5.Хадатайнічаць перад Міністэрствам адукацыі РБ аб выдзяленні універсітэту грашовых сродкаў ці ўдзелу на долевых пачатках у стварэнні санаторыя-прафілакторыя, базы адпачынку ці спартыўна-аздараўленчага лагера.

6.Прафкаму сумесна з аддзелам арганізацыі аховы здароўя распрацаваць сістэму мерапрыемстваў па ахове здароўя працоўных універсітэта.

7.Прафсаюзнаму камітэту сумесна з кафедрай фізічнага выхавання і спартыўным клубам працягваць працу па ўдасканаленні правядзення масавых фізкультурна-аздараўленчых мерапрыемстваў, ствараць умовы для заняткаў у групах здароўя, спартыўных секцыях і клубах.

8.Прафсаюзны камітэт павінен узмацніць кантроль за захаваннем у калектыве становішча, якое выключае незаконныя звальненні, парушэнні рэжыму працоўнага часу і адпачынку.

9.Прафкаму пастаянна клапаціцца аб жанчынах, ствараць умовы для спалучэння мацярынства з актыўным удзелам у працоўнай і грамадскай дзейнасці, умацавання сям'і.

10.Прафкаму сумесна з рэктаратам, саветам ветэранаў вайны і працы распрацаваць мерапрыемствы, прысвечаныя 50-годдзю Перамогі над фашысцкай Германіяй; узмацніць увагу да пенсіянераў, іх патрэбаў і запытаў; дабівацца разумнага спалучэння маладых і вопытных кадраў; праяўляць аб'ектыўнасць і прынцыповасць пры атэстацыі працоўных.

11.Хадатайнічаць перад выканкамам аб выдзяленні дадатковых сродкаў на заканчэнне будаўніцтва дома па вул.Горкага.

12.Прафкаму больш настойліва развіваць калектыўнае садаводства і агародніцтва, арганізавана забяспечваць сельгаспрадуктамі і прадуктамі харчавання працоўных універсітэта.

13.Прафкаму ўзмацніць кантроль за працай бухгалтэрыі, своечасовай выдачай заработнай платы, аплаты камандзіровачных; распрацаваць Палажэнне аб прэміраванні і дэпрэміраванні, устанаўленні даплат і надбавак у адпаведнасці з колькасцю і якасцю працы.

14.Прафсаюзнаму камітэту ўдасканальваць працу па разгляду прапановаў, заяваў і скаргаў супрацоўнікаў; прынцыпова і востра рэагаваць на любы факт парушэння правоў працоўных, рашуча прыпыняць любыя спробы зажыму крытыкі.

15.Прафсаюзная канферэнцыя універсітэта звяртаецца да ўсіх членаў працоўнага калектыву з прапановай актыўна ўключыцца ў кампанію па выбарах у ВС і МС РБ, якія чакаюцца наперадзе; выдвігаць у органы ўлады дастойных і аўтарытэтных прадстаўнікоў працоўнага калектыву, дабівацца з іх дапамогай рашэння вытворчых і прафесійных пытанняў, улічваючы інтарэсы як калектыву універсітэта ў цэлым, так і кожнага яго члена паасобку.

---

**Прэзідэнту, Вярхоўнаму Савету,**
**Кабінету Міністраў Рэспублікі Беларусь.**

## *Зварот дэлегатаў прафсаюзнай канферэнцыі супрацоўнікаў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы.*

Мы, дэлегаты XIX справаздачна-выбарчай прафсаюзнай канферэнцыі супрацоўнікаў Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы звяртаемся да вас, заканадаўчай і выканаўчай улады рэспублікі з наступнай заявай.

Крызіс у эканоміцы, сацыяльнай палітыцы ў многім з'яўляецца вынікам пагардлівых адносін дзяржаўных структур да праблем адукацыі, навукі, аховы здароўя, культуры, якія пакінуты на самавольства дзікага рынку і якія перажываюць сапраўдную катастрофу.

Асаблівую заклапочанасць сёння ў нас выклікае ўзрастаючае абясцэньванне адукацыі, а разам з тым падзенне прэстыжу працы выкладчыкаў, іх статуса ў грамадстве.

Камерцыялізуецца навука, высокакваліфікаваныя спецыялісты пакідаюць вну, скарачаецца аб'ём адукацыйных паслуг. Няма сродкаў для рамонту навучальных і жыллёвых будынкаў, лабараторных корпусаў; для выдання навуковай і навучальнай літаратуры. Страчваюцца сацыяльныя заваёвы: права на працу, бясплатную адукацыю, ахову здароўя, даступнасць да культурных каштоўнасцяў. Па сутнасці, урад адкінуў вышэйшую школу на ўскраек дарогі, праца цэлага пакалення людзей выкінута на «сметнік». Нашы зберажэнні ператварыліся ў нішто. Нас падманвалі і працягваюць падманваць. Спачатку нам недаплочвалі, бралі нібыта ў пазыку пад будаўніцтва «светлай будучыні». Потым падчас эйфарыі «перабудовы» і абвяшчэння суверэнітэту адбылася лібералізацыя цэнаў, неўтаймаваная інфляцыя, пачаўся падзел вынікаў працы цэлых пакаленняў. Цяпер ад нас хочуць, каб мы слепа і пакорліва чакалі чарговых падачак ад ураду, навучалі, выхоўвалі маладое пакаленне дзеля пабудовы новага аддаленнага цывілізаванага грамадства, паклаўшы на гэта сваю энергію, сілы, здароўе, і ізноў жа ўзамен атрымлівалі грашы.

Аднак наш урад да гэтых часоў так і не зразумеў адну простую ісціну: рэфармаваць сістэму адукацыі і навукі можа толькі паўнапраўны грамадзянін, высокакваліфікаваны прафесіянал, вучоны, правы і інтарэсы якога надзейна ахоўваюцца законам. Складаецца ўражанне, што ўрад РБ запамятаваў, што асноўны капітал грамадства - людзі, а галоўная мэта дзяржавы - забяспечыць ім нармальныя ўмовы існавання.

Новы віток лібералізацыі цэнаў, які выяўляецца апошнім часам, без комплексных мераў па вывадзе эканомікі з крызісу, без патрэбнай абароны жыццёва важных інтарэсаў насельніцтва непазбежна прывядзе да сацыяльнага выбуху.

У сувязі са сказаным дэлегаты канфэрэнцыі прапануюць ураду: - ажыцявіць рэальныя дзеянні па стабілізацыі эканомікі, грашова-фінансавай сістэмы; стварэнні роўных умоў для функцыянавання і канкурэнцыі розных формаў уласнасці; правядзенні раздзяржаўлення і прыватызацыі галосна, у інтарэсах працоўных калектываў, усіх катэгорый насельніцтва рэспублікі; спыненні расцягвання народнай уласнасці па кішэнях дзяльцоў «ценевай эканомікі», адміністрацыйнай наменклатуры;

- прыспешыць структурную перабудову эканомікі, накіраваць яе на павелічэнне вытворчасці тавараў народнага спажытку, пашырэнне сферы паслугаў, ліквідацыю манапалізму;
- стварыць умовы для прыярытэтнага развіцця сістэмы адукацыі і навукі, вываду іх з крызіснага фінансавага становішча;
- забяспечыць выкананне закона «Аб адукацыі у РБ» у часткі фінансавання вышэйшай школы і вызначэння заработнай платы прафесарска-выкладчыцкага складу не ніжэй за 150 працэнтаў ад сярэдняга заработку служачых у прамысловасці;
- выдзеліць ільготныя крэдыты для працоўных вышэйшай школы на будаўніцтва кааператыўнага і індывідуальнага жылля;
- прадаставіць установам адукацыі і навукі льготнае падаткаабкладанне;
- вызначыць для працоўных вну кампенсацыю на аплату медыцынскіх паслугаў, лячэння і адпачынку.
- прывесці ў адпаведнасць заробаток педагагічных працоўнікаў з рэальным коштам іх працы.

**По даручэнні канферэнцыі**
**старшыня прафкама ГрДУ**
**імя Янкі Купалы**
**У.А. ХІЛЮТА**



# Працяг навуковых кантактаў

Паміж факультэтамі гісторыі і культуры Гродзенскага універсітэта і Інстытутам гісторыі Беластоцкага філіялу Варшаўскага універсітэта склаліся моцныя навуковыя сувязі. Пацвярджэннем гэтага з'явілася адбыўшаяся 25-26 лістапада 1994 г. ў Беластоку міжнародная навуковая канферэнцыя, прысвечаная найноўшым даследванням па гісторыі Заходняй Беларусі ў 1914-1945 гг. На канферэнцыі прысутнічалі вядомыя вучоныя з Літвы, Беларусі, у прыватнасці, галоўны рэдактар «Беларускага гістарычнага часопіса» -В.Кушнер, прафесар А. Хацкевіч, гродзенскія гісторыкі - прафесар А. Нечухрын і дацэнт Т. Бадзюкова. Трэба адзначыць вельмі высокі ўзровень адбыўшыхся на канферэнцыі дыскусій, асабліва па праблемах гісторыіяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі. Усіх прысутнічаўшых вельмі зацікавіў незвычайны, свежы погляд на праблемы гісторыі Заходняй Беларусі, выказаны ў дакладзе прафесара А. Нечухрына, які выклікаў мноства ўсялякіх водгукаў і меркаванняў. Гродзенскія гісторыкі ўжо другі раз удзельнічаюць у г.н. «выніковых» канферэнцыях па комплекснай сумешчанай навуковай тэме.Вынікамі навуковага супрацоўніцтва з'явіліся не толькі ўжо надрукаваныя артыкулы, але і працягваючаяся падрыхтоўка зборніка дакументаў па гісторыі края ў 1939-41 гг., а таксама прапрацоўка перспектыўнага Дагавора аб супрацоўніцтве на 1995 год. З гэтай мэтай на канферэнцыі прысутнічаў першы прарэктар Гродзенскага універсітэта, вядомы археолаг А.Краўцэвіч. Намечаны далейшыя кірункі супрацоўніцтва і удакладнена тэматыка даследванняў,якая будзе асновай новага дагавора аб навуковым супрацоўніцтве і абмене.

**Т.БАДЗЮКОВА,**
**дацэнт кафедры агульнай гісторыі.**

# ЦЯЖКІ СТАН БІБЛІЯТЭКІ

Больш за восемдзесят тысяч кніг і часопісаў складае фонд бібліятэкі гістарычнага і правазнаўчага факультэтаў, якая размясцілася ў вучэбным корпусе па вуліцы Даватара. Але паслугамі бібліятэкі карыстаюцца не толькі студэнты гэтых факультэтаў. Тут дапамогуць знайсці неабходную літаратуру па гісторыі і правазнаўству ўсім, хто звернецца. Адзіная ўмова, што патрэбнае выданне ёсць у наяўнасці.

Бібліятэка, аб якой ідзе размова, вядомая сваімі багатымі зборамі гістарычных выданняў, сярод якіх нямала рэдкіх. З гэтымі фондамі плённа працуюць навукоўцы універсітэта.

Зусім іншая карціна з вучэбнай літаратурай па правазнаўству. Студэнты займаюцца па падручніках, якія былі выдадзены яшчэ ў часы былога СССР. Мала таго, што яны састарэлі, дык і такіх не хапае. У сярэднім на вучэбную групу прыходзіцца па чатыры-пяць падручнікаў. Яшчэ менш вучэбнай літаратуры для студэнтаў, якія займаюцца на аддзяленні міжнародных эканамічных адносін. У бібліятэку цяпер не паступае сучаснай літаратуры па юрыдычнай тэматыцы, якая выдаецца ў Расіі,- па грамадзянскім праве,банкаўскім, фінансавым заканадаўстве. Не хапае і кніг, якія падрыхтаваны беларускімі выдаўцамі. Гэта вельмі вострая праблема, якая чакае свайго вырашэння.

У маі супрацоўнікі бібліятэкі распаўсюдзілі сярод студэнтаў-завочнікаў анкеты. Мэтай яе было даведацца, што думаюць чытачы аб сваёй бібліятэцы, якасці абслугоўвання. Дык вось, у большасці анкет асноўныя заўвагі датычыліся менавіта дэфіцыту выданняў па праву. Аднадушна ўсе ўдзельнікі анкетавання адзначылі і тое, што бібліятэка гіста-рычнага і правазнаўчага факультэтаў не мае чытальнай залы. І дзе ў такім разе зай-мацца?

І яшчэ пра ўмовы працы супрацоўнікаў бібліятэкі. Не гаворачы ўжо пра заработак, праблем тут таксама хапае. З добрай зайздрасцю ўспамінаюць яны пра колішнюю паездку па абмену вопытам у бібліятэку Віленскага уні-версітэта. Там таксама ёсць калекцыя рэдкай кнігі, але як яна захоўваецца! У спецыяльных шафах, пад шклом! Нам з гэтым даво-дзіцца толькі марыць. Памяшканне былой чатырнаццатай сярэдняй школы, у якой цяпер знаходзіцца бібліятэка, не прыстасавана для гэтых мэтаў. У памяшканні холадна, дрэннае асвятленне; да таго ж жанчынам-бібліятэкарам, каб дастаць з высачэнных стэлажоў патрэбную кнігу, прыходзіцца цягаць цяжкія металічныя лесвіцы...

Такая рэальнасць, ад якой нікуды не дзенешся. Аднак вырашаць праблемы трэба.

**С. КАЗАКЕВІЧ**

**СПОРТ**

# Спартыўная гімнастыка

У канцы мінулага года на спартыўных пляцоўках ГрДУ ў рамках універсітэцкай спартакіяды адбыліся спаборніцтвы па спартыўнай гімнастыцы.

У іх прынялі ўдзел сем зборных камандаў, складзеных з дзяўчын-першакурсніц.



Абсалютнай пераможніцай спартакіяды стала будучы прававед Сняжана Маглыш. На другую прыступку п'едэстала гонару ўзыйшла яе сяброўка па камандзе Аксана Панчанка, на трэцюю - Надзея Багатка.

У камандным заліку першынствавалі юрысты (нам.дэкана па фізкультурнамасавай рабоце А.Кудзель), пачэснае другое месца занялі гімнасткі факультэта псіхалогіі,трэцяе - замежных моваў.

**О.СМАЛЯКОЎ, галоўны суддзя спаборніцтваў.**



Галоўны рэдактар Н.КРАСНІЦКАЯ.
Рэдактар А.СЦЕПАНЕНКА.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не паздзяляючы пункту гледжання аўтара.

Наш адрас:
230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 404. Тэл. 44-72-97

Газета выходзіць адзін раз у месяц. Аб'ём газеты - адзін друкаваны аркуш.

З.168

Наклад 500 асобнікаў.

Газета набрана і звёрстана на камп'ютарнай тэхніке выдавецкага аддзела універсітэта,аддрукавана у Гродзенскай абласной узбуйнёнай друкарні.

Рэгістрацыйнае пасведчанне 421.

Заснавальнікі: Вучоная Рада універсітэта,прафкам супрацоўнікаў, прафкам студэнтаў.